Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

# ПІСЬМЕННІК, ВУЧОНЫ, ЧАЛАВЕК

Імя выдатнага беларускага паэта, вучонага-акадэміка, грамадскага і культурнага дзеяча Пятра Фёдаравіча Глебкі (1905–1969) шырока вядома не толькі ў Беларусі, але і па-за яе межамі. Чалавек надзвычай таленавіты, высокаадукаваны, інтэлігентны, ён пакінуў свой яркі след не толькі ў айчыннай літаратуры і навуцы, але і ў сэрцах шматлікіх яго сучаснікаў.

Прайшоўшы вялікую, часам няпростую жыццёвую школу, сустракаючы на сваім шляху добрае і благое, узлёты і расчараванні, Пятро Глебка здолеў захаваць, нягледзячы а ні на якія акалічнасці, юначы агеньчык, чысціню душы і памкненняў. Ён да канца сваіх дзён заставаўся сумленным грамадзянінам і чалавекам, адданым сынам сваёй Бацькаўшчыны.

Жыццяпіс Пятра Глебкі ў многім сугучны з біяграфіямі яго сучаснікаў – беларускіх пісьменнікаў, сялянскіх сыноў, чыё станаўленне як літаратараў прыпала на 20-я гады XX стагоддзя.

Пятро Глебка нарадзіўся 6 ліпеня 1905 г. у в. Вялікая Уса, што на Уздзеншчыне, у шматдзетнай сям'і Тодара і Таццяны Глебкаў. Вучыцца Пятрусь пачаў са спазненнем, але прыродныя здольнасці і вялікае жаданне атрымаць веды дапамаглі яму дагнаць сваіх аднагодкаў. Акрамя царкоўнапрыходскай школы і вышэйшага пачатковага вучылішча, хлопчык у 1923 г. скончыў і Уздзенскую сямігодку.

Далейшае навучанне адбывалася ў Мінскім беларускім педтэхнікуме імя У. Ігнатоўскага, куды Пятро паступіў у 1924 г. Там разам з ім вучыліся будучыя вядомыя літаратары Паўлюк Трус і Алесь Якімовіч – яго сябры яшчэ па Уздзенскай школе, а таксама Андрэй Александровіч, Максім Лужанін ды іншыя, а сярод выкладчыкаў быў і сам Якуб Колас.

Яшчэ ў школе юнак спрабаваў праз вершаваныя радкі выказаць свае думкі, пачуцці, хваляванні. Яго вершы змяшчаліся ў школьным часопісе «Вір», але да сапраўднай літаратурнай справы П. Глебка далучыўся ў Мінску.

Вучоба ў тэхнікуме, безумоўна, спрыяла развіццю паэтычнага таленту будучага паэта. У гэтай жа навучальнай установе існавала студыя літаратурнага аб'яднання «Маладняк».

Першыя паэтычныя публікацыі П. Глебкі пазначаны 1925 годам. Яго вершы з'яўляюцца на старонках беларускай перыёдыкі: у часопісах «Маладыя араты», «Беларускі піянер», газетах «Беларуская вёска», «Савецкая Беларусь» і іншых выданнях.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Тады ж, у 1925 г., Пятро Глебка ўступае ў літаратурную арганізацыю маладых пісьменнікаў Беларусі «Маладняк» (1923–1928), але ўжо праз год выходзіць з яе, паколькі некаторыя прынцыпы, дэклараваныя часткай маладнякоўцаў, такія як адмаўленне літаратурнай спадчыны, традыцый і іншыя, былі для маладога літаратара непрымальныя.

Малады паэт далучаецца да новага літаратурнага згуртавання «Узвышша» (1926–1931), створанага з ініцыятывы былых маладнякоўцаў А. Бабарэкі, К. Чорнага, У. Дубоўкі, Я. Пушчы, К. Крапівы, З. Бядулі.

У задачу ўзвышаўцаў уваходзіла стварэнне высокамастацкай нацыянальнай літаратуры з выкарыстаннем лепшых здабыткаў папярэднікаў: жывой народнай мовы, фальклору, класічнай літаратуры – са спалучэннем разнастайных форм і стыляў.

Акрамя іншага, аб'яднанне займалася выданнем літаратурных зборнікаў, мела ўласны часопіс, сакратаром якога некаторы час быў Пятро Глебка.

«Узвышша» станоўча паўплывала на развіццё самабытнага паэтычнага таленту Глебкі, у многім змяніла яго творчую манеру. Па словах літаратуразнаўца В. Максімовіча, яна стала больш стрыманай, рэфлексійна-разважлівай, псіхалагічна заглыбленай[1]. Гэта пацвярджае і першая кніга паэта – зборнік «Шыпшына» (1927) – «красамоўны ўзор лірычнай паэзіі, глыбокае выяўленне паэтавай душы»[2].

У 1927 г. П. Глебка перавёўся на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, якое паспяхова скончыў у 1930 г. Вучоба ва ўніверсітэце спрыяла раскрыццю творчага патэнцыялу будучага пісьменніка, дапамагала акрэсліць літаратурныя задачы, вызначыць далейшы напрамак дзейнасці.

Па заканчэнні ўніверсітэта выпускнік Глебка ўладкаваўся на пасаду загадчыка аддзела ў газету «Калгаснік Беларусі» (1931–1932), працаваў у часопісе «Полымя рэвалюцыі». З моманту ўтварэння Саюза пісьменнікаў БССР (1934) з'яўляўся яго членам, быў абраны дэлегатам на Першы пісьменніцкі з'езд. У 1934–1936 гг. працаваў кансультантам па паэзіі пры Саюзе пісьменнікаў БССР.

Значны ўплыў на творчасць П. Глебкі ў гэты перыяд аказалі класікі беларускай літаратуры Я. Купала і Я. Колас, якія падтрымлівалі і накіроўвалі маладога таленавітага пісьменніка. Нягледзячы на спецыфічную атмасферу 1930-х гадоў, звязаную з жорсткімі палітычнымі рэпрэсіямі, у тым ліку і ў дачыненні да пісьменнікаў, паэт працягваў актыўна пісаць. З-пад яго пяра выходзяць вершы, у якіх выразна гучаць грамадзянскія матывы, звязаныя з палітычнымі рэаліямі таго часу. Пры гэтым, як заўважыў літаратуразнавец А. Яскевіч, «Пятро Глебка пры ўсёй сацыялагічнай зададзенасці, як кажуць, завербаванасці тагачаснай літаратуры, імкнуўся, умеў заставацца тонкім пранікнёным

---

[1] *Максімовіч В.* Ранняя творчасць Пятра Глебкі // Матэрыялы навук. канф., прысвеч. стагоддзю з дня нарадж. акад. П. Ф. Глебкі. Мінск, 2006. С. 60.

[2] Тамсама.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

лірыкам»[1]. Сярод выдадзеных Глебкавых кніг гэтага перыяду: «Хада падзей» (1932), «Арка над акіянам» (1932), «Урачыстыя дні» (1934), «Чатыры вятры» (1935), «Мужнасць» (1938).

У гады Вялікай Айчыннай вайны П. Ф. Глебка, як і многія іншыя беларускія пісьменнікі, трапіў на фронт. Працаваў у франтавой газеце «Красноармейская правда», потым – на Заходнім і Калінінскім франтах у рэдакцыях газет «За Савецкую Беларусь» і «За свабодную Беларусь». У канцы 1942 г. ён быў накіраваны ў Маскву. У 1943–1945 гг. працаваў там рэдактарам выдавецтва ЦК КПБ «Савецкая Беларусь», галоўным рэдактарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР.

Сярод лепшых твораў паэта ваеннага часу – вершы «Партызаны», «Смерць салдата», «Дзень вайны», «Мы вернемся» і іншыя, што друкаваліся ў сатырычнай газеце-плакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну», у «Партызанскай дубінцы» і іншых выданнях. Даследчыкі творчасці П. Глебкі лічаць, што менавіта ў вайну ім былі напісаны лепшыя творы, «дасканалыя па гуманістычным змесце і класічнай "прастаце" выканання»[2]. Менавіта ў іх паэт здолеў «узняцца да шырокіх быційных абагульненняў, такіх адвечных паняццяў, як жыццё і смерць»[3]. Лірыка ваеннага перыяду можа лічыцца вяршыняй літаратурнай працы Пятра Глебкі[4].

Па заканчэнні вайны пісьменнік з радасцю вяртаецца на радзіму, актыўна ўключаецца ў грамадскае і культурнае жыццё краіны, працягвае літаратурную працу.

У пасляваеннай творчасці П. Ф. Глебкі дамінуюць такія важныя і актуальныя тэмы, як узнаўленне разбуранай Бацькаўшчыны, барацьба за мір, памяць аб мінулай вайне.

Ён стварае лібрэта оперы ў пяці частках пад назвай «Лясное возера» (першапачатковая назва «Андрэй Касценя»), дзе правобразам галоўнага героя, Андрэя Касцені, з'яўляецца вядомы беларускі падпольшчык Канстанцін Заслонаў, працуе над вершаванай драмай «Святло з Усходу», піша вершы, літаратурна-крытычныя і публіцыстычныя артыкулы.

Трэба адзначыць, што Пётр Фёдаравіч быў не толькі выдатным беларускім паэтам, але, як гэта найчасцей уласціва сапраўдным таленавітым літаратарам, вельмі тонка адчуваў і разумеў літаратурнае слова сваіх бліжэйшых суседзяў: расіян і ўкраінцаў – і па-майстэрску здолеў данесці яго праз добры мастацкі пераклад і да беларускага чытача. Асабліва гэта тычыцца перакладаў твораў класіка ўкраінскай літаратуры Т. Шаўчэнкі. Па словах літаратуразнаўцы Ж. С. Шаладонавай, П. Глебка «праявіў высокі прафесійны ўзровень, адмысло-

[1] *Яскевіч А. С.* Выбранае – часам // Матэрыялы навук. канф., прысвеч. стагоддзю з дня нарадж. акад. П. Ф. Глебкі. С. 79.

[2] Тамсама. С. 80.

[3] *Ліс А. С.* Пятро Глебка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. Мінск, 1986–2003. Т. 4. Кн. 2. 2003. С. 239.

[4] Тамсама. С. 242.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

вае перакладчыцкае майстэрства» ў адносінах да твораў вялікага Кабзара. Ашчаднае і вельмі далікатнае стаўленне Глебкі да паэтычнага слова Т. Шаўчэнкі робіць гэтыя пераклады запатрабаванымі і сёння[1].

У 1945 г. Пятра Фёдаравіча Глебку, чалавека высокаадукаванага, надзвычай кампетэнтнага практычна ва ўсіх галінах гуманітарных ведаў, сапраўднага энцыклапедыста, запрашаюць на працу ў Акадэмію навук БССР, у Інстытут літаратуры, мовы і мастацтва, дзе з 1952 г. член-карэспандэнт П. Ф. Глебка (выбраны ў 1950 г.) узначальвае сектар лексікаграфіі, а ў 1956 г. становіцца на чале Інстытута мовазнаўства.

Гэты выбар не быў выпадковым. Пісьменнік заўсёды беражліва ставіўся да роднай мовы, клапаціўся пра яе чысціню. Пра гэта сведчаць яго артыкулы «Аб мове пачынаючых пісьменнікаў» (1934), «Нататкі пра беларускую літаратурную мову» (1950) і інш.

Яшчэ ў 1944 г. П. Глебку прызначылі кіраўніком групы па стварэнні руска-беларускага слоўніка. Карпатлівая, напружаная праца вымагала не толькі значнага адрэзку часу і вялікага чалавечага рэсурсу, але перш за ўсё патрабавала распрацоўкі адпаведнай канцэпцыі, што і было зроблена Пятром Фёдаравічам з улікам станоўчага лексіграфічнага вопыту яго папярэднікаў і тых недахопаў, што былі ўласцівы іншым падобным слоўнікам. Слоўнікавая канцэпцыя Глебкі была падтрымана Я. Коласам і К. Крапівой, якія таксама прымалі ўдзел у складанні гэтага выдання, разам з П. Глебкам з'яўляліся яго навуковымі рэдактарамі. Надрукаванне слоўніка ў 1953 г., безумоўна, мела пазітыўнае значэнне. Выданне доўгі час заставалася адным з самых папулярных лексікаграфічных даведнікаў такога кшталту.

Пятра Фёдаравіча Глебку, чалавека шырокага кругагляду, цікавіла вельмі многае. У кола яго інтарэсаў уваходзілі не толькі літаратура, мова, але і гісторыя, філасофія, народнае і выяўленчае мастацтва, музыка, кіно, тэатр і шмат чаго іншага. І невыпадкова, што менавіта з яго ініцыятывы ў 1957 г. пры Аддзяленні грамадскіх навук АН БССР было створана новае структурнае падраздзяленне, комплексная навукова-даследчая ўстанова – Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, які і ўзначаліў П. Ф. Глебка. У тым жа годзе ён быў абраны акадэмікам АН БССР.

Кіраваць такой шматпрофільнай навуковай установай было даволі складана, і вось тут вельмі яскрава праявіўся яго талент як кіраўніка-арганізатара. Глебкам была распрацавана канцэпцыя развіцця Інстытута. Дзякуючы яго намаганням рыхтаваліся дастойныя навуковыя кадры. Па ўспамінах былых супрацоўнікаў, Пятро Фёдаравіч, як сапраўдны падзвіжнік, самаахвярна дапамагаў навукоўцам у іх працы, уважліва сачыў за навуковым ростам, рэдагаваў іх рукапісы, адсоўваючы пры гэтым на другі план свае ўласныя задумы і планы. Як справядліва адзначаюць даследчыкі, ім падрыхтавана цэлая плеяда

[1] *Шаладонава Ж. С.* Пятро Глебка – перакладчык з украінскай мовы // Матэрыялы навук. канф., прысвеч. стагоддзю з дня нарадж. акад. П. Ф. Глебкі. С. 66, 67.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

прадстаўнікоў беларускай гуманітарнай навукі, якія і сёння плённа працуюць на карысць грамадства[1].

Грунтоўная дасведчанасць П. Глебкі амаль ва ўсіх галінах гуманітарнай навукі стварала яму несумненны аўтарытэт сярод калег-навукоўцаў. Па ўспамінах былога супрацоўніка Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі А. Сабалеўскага, уражвала дасканалае веданне Пятром Фёдаравічам канкрэтнага матэрыялу. Здзіўляла глыбокае пранікненне яго ў сутнасць з'яў, уменне глянуць, што называецца, у корань, і нават лакальныя пытанні ўзняць да вялікіх маштабаў[2].

Пры непасрэдным удзеле П. Ф. Глебкі была распачата велізарная праца па збіранні і падрыхтоўцы да выдання шматтомнага збору беларускага фальклору, за які ў 1986 г. калектыў вучоных быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР. З яго ініцыятывы ў Інстытуце быў створаны аддзел па выяўленні і вывучэнні помнікаў гісторыі і культуры Беларусі з мэтай падрыхтоўкі сямітомнага Зводу помнікаў. Шмат іншых карысных пачынанняў таксама было звязана з імем гэтага неардынарнага чалавека, таленавітага вучонага, арганізатара ад Бога.

Навуковыя здабыткі і арганізатарскі талент П. Ф. Глебкі былі заўважаны акадэмічным кіраўніцтвам. Ён становіцца акадэмікам-сакратаром Аддзялення грамадскіх навук. На гэтай пасадзе вучоны за вельмі непрацяглы тэрмін (1968–1969) здолеў дасягнуць значных поспехаў. Менавіта ім быў закладзены надзейны падмурак для далейшага развіцця беларускай гуманітарыстыкі, стварэння навуковых школ у айчынным мовазнаўстве, фалькларыстыцы, этналогіі. Як сведчаць А. І. Лакотка і Л. Ч. Дрожжа, дзякуючы выдатным арганізацыйным здольнасцям Пятра Фёдаравіча, а таксама неабыякавым адносінам да стану нацыянальнай культуры, інстытуты Аддзялення грамадскіх навук атрымалі дадатковае дзяржаўнае фінансаванне для навуковых даследаванняў, што ў сваю чаргу дало магчымасць для распрацоўкі шматгадовых навуковых праграм і тэм па гісторыі беларускага народа са старажытных часоў і да нашых дзён, садзейнічала вырашэнню тэарэтыка-метадалагічных праблем філасофскай і сацыялагічнай мыслі, удасканальванню прававога рэгулявання грамадскіх адносін і ўмацаванню правапарадку[3].

Акрамя літаратурнай і навуковай дзейнасці, П. Ф. Глебка ажыццяўляў шырокую грамадска-культурную працу. Неаднаразова з 1955 па 1967 г. яго выбіралі дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. У складзе беларускай дэлегацыі ён чатыры разы прымаў удзел у рабоце сесій Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (1955–1957, 1964).

За заслугі перад Радзімай П. Ф. Глебка быў узнагароджаны ордэнам В. І. Леніна (1965), двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1949, 1955),

---

[1] *Лакотка А. І., Дрожжа Л. Ч.* Пятро Глебка і беларуская культура і навука // Матэрыялы навук. канф., прысвеч. стагоддзю з дня нарадж. акад. П. Ф. Глебкі. С. 9.

[2] *Сабалеўскі А.* Радкі ўспамінаў // Тамсама. С. 15.

[3] *Лакотка А. І., Дрожжа Л. Ч.* Пятро Глебка і беларуская культура і навука. С. 8, 9.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

ордэнамі Чырвонай Зоркі (1943), «Знак Пашаны» (1939), медалямі, ганаровымі граматамі.

Усе тыя, хто ведаў Пятра Фёдаравіча, асабіста сутыкаўся з ім пры розных нагодах, адзначалі яго чалавечую абаяльнасць, сціпласць, прыроджаную тактоўнасць, пачуццё гумару, адкрытасць у адносінах да суразмоўцы. І ўсё гэта спалучалася з вялікай эрудыцыяй, навуковай кампетэнтнасцю, глыбіннай народнай мудрасцю.

У самых розных жыццёвых абставінах Пятро Глебка заўсёды заставаўся самім сабою, з уласцівым яму пазітывам, уменнем ствараць вакол сябе атмасферу добразычлівасці і паразумення.

Некалі ў накідах да кнігі «Мая анкета» ён напісаў: «У чалавека пасля смерці застаецца адно – толькі памяць аб ім...»[1] Няхай жа вобраз гэтага таленавітага і высакароднага чалавека назаўсёды застанецца ў народнай памяці.

*Марына Ліс*

[1] *Глебка Пятро.* Мая анкета // Зб. тв. : у 4 т. Мінск, 1986. Т. 4. С. 331.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by